# Спатканьне з прэм’ер–міністрам

У чацьвер 23 красавіка 1992 г. у Варшаве адбылася сустрэча прэм’ер–міністра беларускага ўраду Вячаслава Кебіча і суправаджаючых яго асобаў (у тым ліку міністра замежных справаў Пятра Краўчанкі) з прадстаўнікамі беларускага грамадзтва ў Польшчы.

Прэм’ер–міністар В. Кебіч прыняў беластоцкіх і варшаўскіх беларусаў у сваёй варшаўскай рэзыдэнцыі на вуліцы Парковай. Ужо едучы на сустрэчу, мы адчувалі душэўную асалоду, гледзячы на незьлічоныя беларускія сьцягі, што ўпрыгожвалі трасу ад аэрадрому да рэзыдэнцыі. Яшчэ летась было такое, што ў Менску сарвалі адзіны бел–чырвона–белы сьцяг, вывешаны на 25 Сакавіка, а сёлета прыяжджаюць пад ім прадстаўнікі ўраду. Пэўна, пераварочваюцца ў трунах санацыйныя ліквідатары беларушчыны, законныя пераймальнікі якіх вітаюць цяпер беларускі сьцяг з усімі пашанамі.

Сама сустрэча прайшла, як той кажа, у атмасфэры поўнага паразуменьня. З праблемамі беларусаў у Польшчы пазнаёмілі прэм’ер–міністра старшыня БГКТ А. Баршчэўскі і пасол Я. Чыквін. Балячкі нашыя вядомыя, дык ня буду пра іх расьпісвацца. Вядома таксама, што магчымасьці Беларусі дапамагаць нам пакуль што невялічкія, і мусім яшчэ цярпліва пачакаць. Аднак прэм’ер–міністар В. Кебіч абавязаўся хадайнічаць па магчымасьці за справы беларусаў у Польшчы.

Пры сустрэчы высьветлілася, што прэм’ер–міністар ураду РБ, насуперак чуткам, зь беларускай мовай ніякіх цяжкасьцяў ня мае, бо яна для яго родная, ды і школу ён скончыў беларускую. Карыстаньне расейскай мовай у афіцыйных выступленьнях вынікае, відаць, з прыроджанага беларусам пачуцьця прыніжанасьці, ад якога, як тут, так і там, мы паволі вызваляемся. Усё–такі больш прыемна быць сабою, і прэм’ер–міністар Кебіч, як гаспадар сустрэчы, быў відочным доказам гэтага. У час менш афіцыйнай часткі спатканьня стварыў ён атмасфэру сапраўднай свойскасьці.

Застаецца чакаць вынікаў візыту беларускай дэлегацыі ў Варшаве — падпісаньня польска–беларускай дамовы, абмену пасламі, разьвіцьця гаспадарчага і культурнага супрацоўніцтва, усяго таго, што ставарае нармальныя суседзкія стасункі паміж дзяржавамі.

Беларусы Беласточчыны чакаюць таксама візыту прэм’ер–міністра Беларусі ў Беласток і навакольле, на што спадар Кебіч выказаў ахвоту і спадзяваньне.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1992. 24 мая. № 21. С. 1.